Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б)Б і ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 45 (59) Пятніца, 21 верасня 1945 г.

**Сяляне і сялянкі, шырэй размах сацыялістычнага спаборніцтва за датэрміновую здачу збожжа дзяржаве! Дадзім больш хлеба роднай краіне, Чырвонай Арміі!**

# Вышэй тэмпы хлебапаставак!

## Падрыхтуем дастойныя падарункі Радзіме

24 верасня спаўняецца XXV год з дня склікання першага з'езда комсамола Беларусі. Гэты дзень стаў лічыцца днём стварэння комсамола Беларусі.

Дваццаціпяцігадовы юбілей—вялікая палітычная падзея ў жыцці комсамола і ўсёй моладзі рэспублікі. К гэтаму дню разгарнулася дзейсная падрыхтоўка. Падрыхтаваць Радзіме дастойныя падарункі—імкненне усіх комсамольцаў.

Комсамольцы нашага раёна актыўна ўключыліся ў работу па выкананню хлебапаставак дзяржаве. Комсамольская арганізацыя Іпаўскага сельсовета, у якой налічваецца 7 чалавек, здала звыш плана 420 кілограм збожжа, комсамольцы Асіпавіцкага сельсовета—500 кілограм, комсамольцы вёскі Віры, Першамайскага сельсовета—762 кг. і другія. На 15 верасня па раёну здана комсамольцамі 12,5 тон хлеба.

У сувязі з падрыхтоўкай да юбілея ў комсамольскіх арганізацыях палепшылася ўнутрысаюзная работа, масава-палітычная работа сярод несаюзнай моладзі, увялічваецца рост радоў комсамола. Задача комсамольскіх арганізацый і ўсіх комсамольцаў узначаліць палітычную актыўнасць моладзі раёна, накіраваць іх увагу на хутчэйшае завяршэнне хлебапаставак, на падрыхтоўку дастойных падарункаў маці-Радзіме.

### У ЧЭСЦЬ ГІСТАРЫЧНАГА СВЯТА

Узмоцненай здачай збожжа дзяржаве адзначылі сяляне Акцябрскага, Першамайскага, Худлінскага, Аніскавіцкага сельсоветаў вялікае гістарычнае свята—дзень уз'еднання беларускага народа ў адзінай беларускай дзяржаве. Сяляне гэтых сельсоветаў даставілі на пункт Загатзярно звыш 11 тон збожжа.

Многія вёскі, як Брадок, Заніўеўскага сельсовета, Варатынічы, Акцябрскага сельсовета, Віры, Першамайскага сельсовета і другія поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках.

## Справы галоўчыцкіх комсамольцаў

З вялікім уздымам рыхтуюцца да 25-годдзя комсамола Беларусі комсамольцы Галоўчыцкага сельсовета. Усе комсамольцы разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках і здалі ў фонд Чырвонай Арміі 1925 кілограм хлеба.

Вялікую масава-палітычную работу праводзяць комсамольцы сярод сялян. За комсамольцамі замацаваны участкі, дзе яны сярод сялян праводзяць чытку газет, выпускаюць баявыя лісткі, у якіх асвятляецца ход сацыялістычнага спаборніцтва, паказваюцца перадавікі хлебапаставак.

Ва ўсёй рабоце асабліва вызначаюцца Юдзенкова Л. С., Лeўковіч В. В.

**Ваўрук,**
сакратар Галоўчыцкай комсамольскай арганізацыі.

### ДОБРА ПРАЦУЕ ЎПАЎНАВАЖАНЫ СЕЛЬСОВЕТА

Добрасумленна выконвае свае абавязкі ўпаўнаважаны Асіпавіцкага сельсовета па вёсцы Хамічыцы т. Клімук Васілій. Ён арганізоўвае сялян на датэрміновае выкананне збожжапаставак дзяржаве, своечасова праводзіць ўлік і прадастаўляе зводкі ў сельсовет аб ходзе выканання збожжанарыхтовак сялянамі.

У рэзультаце сацыялістычнага спаборніцтва сялян, участак, дзе працуе ўпаўнаважаным т. Клімук, датэрмінова разлічыўся з дзяржавай па збожжапастаўках.

**Гардзіевіч.**

### ЗВОДКА

**Аб ходзе збожжапаставак дзяржаве і ў фонд Чырвонай Арміі па раёну на 20 верасня.**

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Акцябрскі | 83,5 |
| 2 | Дзеткавіцкі | 71,5 |
| 3 | Худлінскі | 62,0 |
| 4 | Антопальскі | 58,4 |
| 5 | Заніўеўскі | 57,8 |
| 6 | Першамайскі | 55,1 |
| 7 | Іпаўскі | 53,4 |
| 8 | Асіпавіцкі | 52,6 |
| 9 | Дзямідавіцкі | 51,6 |
| 10 | Аніскавіцкі | 51,5 |
| 11 | Галоўчыцкі | 49,6 |
| 12 | Гарадзецкі | 44,8 |
| 13 | Каменскі | 44,3 |
| 14 | Дзяржыноўскі | 41,1 |

Па раёну: 56,4

# Навярстаць упушчанае, пасеяць хутка і добраякасна

Каб атрымаць высокі ўраджай, неабходна выконваць усе аграправілы, гэта значыць добра падрыхтаваць і ўгнаіць глебу, адабраць лепшае насенне і своечасова пасеяць. Для нашай вобласці лепшым тэрмінам сяўбы з'яўляецца першая палавіна верасня. Але многія сяляне Камянецкага, Дзямідавіцкага, Першамайскага сельсаветаў мала, што гэты тэрмін упусцілі, а і зараз не спяшаюцца з сяўбой. Зацяжная сяўба значна зніжае ўраджай.

Выгаднасць ранніх пасеваў усім вядома. Ранні пасеў успявае добра разрасціся і закараніцца, а ў далейшым без страт перанесці зімоўку, вясною хутка пачынае вегетацыю і з'яўляецца больш устойчывым супроць усякіх хвароб. Раннія пасевы даюць на 20—30 процантаў большы ураджай, чым пасевы, якія толькі ўспелі да марозаў пусціць маленькія кволыя расткі.

Для нармальнага развіцця азімага жыта ў перыяд восені патрабуецца 35—45 дзён, а пагэтаму патрэбна зараз звярнуць самую вялікую ўвагу правядзенню сяўбы ў самыя сціслыя тэрміны.

На сяўбу азімых трэба выкарыстаць усю цягавую сілу. Дзе недастае коней, патрэбна іх замяніць каровамі, як гэта і робяць многія сяляне Галоўчыцкага сельсовета.

Наш раён значна адстаў у сяўбе азімых. Лепшыя тэрміны сяўбы ўжо сцяклі. Трэба прыкласці ўсе намаганні да таго, каб навярстаць упушчанае, пасяць хутка і добраякасна.

**В. Барысюк,**
галоўны аграном райземаддзела.

## ДАПАМАГАЮЦЬ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІМ СЕМ'ЯМ

Сяляне вёскі Татарнавічы, Асіпавіцкага сельсовета, якія маюць цягавую сілу, дапамагаюць у засеве зямлі пад азімыя бясконным гаспадаркам. Так, дэмабілізаваны з Чырвонай Арміі Васілій Кузьміч, аказаў дапамогу ў апрацоўцы зямлі інваліду Айчыннай вайны Кулецкаму, чырвонаармейскай сям'і Злотнік Агафі, Вакульчыку Андрэю і другім. Актыўна аказвае дапамогу сем'ям военнаслужачых Сінкевіч Сямен і другія.

## ДАПАМОГА МТС СЯЛЯНАМ

Для хутчэйшага абмалоту новага ўраджаю Антопальская машына-трактарная станцыя ў дапамогу сялянам выдзеліла трактар і паўскладаную малатарню.

У Першамайскім сельсовеце паўскладанай малатарняй намалочана 72 цэнтнеры хлеба.

Таксама сялянам аказвае дапамогу ў правядзенні азімай сяўбы конна-пракатны пункт. На сялянскіх работах занята 15 коней.

## УПРЫГОЖЫЛІ МАГІЛКІ ЗАГІНУЎШЫХ ВОІНАЎ

Комсамольцы Антопальскай сярэдняй школы упрыгожылі магілкі загінуўшых воінаў. На плошчы Красных танкістаў раённага цэнтра комсамолкі Міронава В., Бандарук Н. і другія на магілкі ўзлажылі вянкі з цвятоў, а таксама упрыгожылі помнік воінам, загінуўшых у 1939 годзе пры вызваленні Заходняй Беларусі ад польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

**В. Самовіч.**

# ПРЫЗЫЎ У ШКОЛЫ Ф З Н

Згодна пастановы ўрада з 15 верасня пачаўся прызыў гарадской моладзі і з 15 кастрычніка будзе прызывацца сельская моладзь ў рамесніцкія, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага навучання.

Партыя і совецкі ўрад праяўляюць выключныя клопаты аб моладзі, якая навучаецца ў школах Ф З Н. Вучні рамесніцкіх, чыгуначных вучылішч і школ Ф З Н, увесь перыяд навучання, знаходзяцца на поўным забеспячэнні дзяржавы, навучаюцца бясплатна, атрымоўваюць харчаванне, адзенне і г. д.

Вялікая цяга нашай моладзі да вучобы. У газеце „Советская Белоруссия" ад 15 верасня ў перадавым артыкуле прыводзяцца прыклады, што яшчэ да пачатку прызыва пачалі паступаць заявы ад добраахвотнікаў. У мінскае рамесніцкае вучылішча № 9 на 200 месц ужо падана 500 заяў, у магілёўскую школу Ф З Н № 9 на 100 месц—250 заяў.

Вучыцца і працаваць у прамысловасці наша моладзь лічыць вялікім гонарам, бо перад ёю адкрываецца вялікая дарога ў жыццё. Многія юнакі і дзяўчаты нашага раёна, якія паехалі ў 1944 годзе ў школы Ф З Н, прысылаюць да сваіх родных пісьмы, дзе расказваюць аб сваёй вучобе і жыцці. Вось, што піша з г. Ніжняга Тагіля ў раённы цэнтр Біліцкай Ольге Якаўлеўне яе сын Сяргей:

„.... Вучуся на токара. Хутка авалодаю спецыяльнасцю, буду кваліфікаваным рабочым. Па мне не сумуйце. Я ўсім забяспечан, жыць весела".

Прызыў у рамесніцкія, чыгуначныя вучылішчы, школы Ф З Н—сур'езная задача. Нам трэба паслаць на вучобу лепшых юнакоў і дзяўчат, каб яны сталі дастойным папаўненнем рабочага класа.

Да правядзення прызыва патрэбна добра падрыхтавацца. Трэба шырока разгарнуць сярод моладзі вялікую масавую работу, растлумачыць аб вялікім радасным жыццёвым шляху, які перад ёю адкрываецца.

Аказаць правесці гэту работу павінны ўсе партыйныя і совецкія работнікі, комсамольцы раёна.

**О. П. Марозава,**
заг. аддзелам выканкома райсовета.

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГД 14866 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.